*Тэкст, расшыфроўка песень: І.В. Глушэц*
*Фота: І.В. Глушэц, К.М. Міхнавец, А.У. Белавусаў*
*Макет: К.У. Ціханава*
*Камп'ютарны набор: І.В. Глушэц*
*Адказны за выпуск: М.І. Шамшэня*
*Надрукавана Гомельскім АЦНТ*
*Адрас: 246022, г. Гомель, вул. Кірава, 49.*
*Тэл. 77-50-95*

*Установа «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці»*

# Народны фальклорны ансамбль «Дубравіца»



Рычоўскі цэнтр традыцыйнай культуры
Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці

**2013 г. Гомель**



**Народны фальклорны ансамбль “Дубравіца” Рычоўскага цэнтра традыцыйнай культуры Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці**

Народны фальклорны ансамбль “Дубравіца” быў утвораны ў 1950 г. Такую назву калектыў атрымаў таму, што вёска Рычоў размяшчаецца каля дубравы ўздоўж берага ракі Сцвіга. Заснавальнікам і кіраўніком ансамбля доўгі час з’яўляўся Васіль Пятровіч Лукашэвіч, настаўнік мясцовай сярэдняй школы. У 1989 г. ансамбль запісваўся ў рэспубліканскім Доме радыё, у 1991 г. удзельнічаў у здымках перадачы “Крыніцы” абласнога тэлебачання, у 1998, 2004 і 2012 гг. – у здымках рэспубліканскага тэлебачання. У 2005 г. ансамбль атрымаў найменне “народны непрафесійны (аматарскі) калектыў”. З 1999 г. кіруе ансамблем Ганна Мікалаеўна Бурак. Калектыў прымае актыўны ўдзел у разнастайных мерапрыемствах, адзначаны дыпломамі абласных і рэспубліканскіх фестываляў.

Самабытную песенную культуру роднай вёскі ансамбль “Дубравіца” раскрывае найперш праз шырокую жанравую разнастайнасць свайго рэпертуару. Акрамя жанраў традыцыйнага каляндарна-земляробчага цыклу (калядныя, веснавыя песні), надзвычай поўна прадстаўлены вясельны цыкл, у тым ліку каравайныя песні. З песень пазаабрадавых жанраў слухачоў больш за ўсё закранаюць “лесав**ыя**”, якія выконваліся пры зборы грыбоў і ягад у лесе, і, канешне ж, лірычныя з традыцыйнай палескай падводкай – верхнім саліруючым голасам.




ЕЛЬСКИЙ
РАЙОН

## Гу, весна!

Гу, весна, гу, красна,
Шо ты нам прынесла? Гу!

Ці по яечку, ці по піражэчку,
Ці сыра кусок, ці масла брусок? Гу!

Гу, весна, гу, красна,
Ўсе мацеры ткуць кросна. Гу!

Мая маці не прала,
Пад лёд мучкі пускала. Гу!

Плыві, лянок, валакенцом,
А прыплыві палаценцом. Гу!

## Вясельная

Як жаніх едзе по невесту, гаварылі “Поезд едзе”. Во главе з караваем. Маршалкі несуць каравай вышэ галавы, наражоны. Пад’езжаюць до двора маладое. Маладое ў дварэ суета, крыкі. Зрабілі масцерскую сапожную, сапагі падбіваюць, іх не пускаюць у двор, б’юцца, ваююць. А група жанок вышла і спевае:

Да не наступай, Літва,
Да не наступай, Літва,
Бо будзе з вамі бітва.
Будом біці да воёваці,
Да Олечку не ‘тдаваці.

## Лесавая

Ой, выйду я на вуліцу погуляць,
На вуліцы ўсё й трава-мурова.

На вуліцы ўсё й трава-мурава.
Дзе не гляну – то чужа сторона.

Ой, старонка, ты старонушка моя,
Як мне цебе прызабуціса?

Як мне цебе прызабуціса,
Ўночы сплючы, а ўдзень ходзячы.

Ўночы сплючы, а ўдзень ходзячы,
З соловеюшком гаворачы.

Соловейко, ты мой брацейко,
Ці не быў ты на моёй стороне?

Ці не быў ты на моёй стороне,
Ці не плачуць оцец, маці по мне?

Оны плачуць, убіваюцца,
Шой суботы прыбіраюцца.

Шой суботы прыбіраюцца,
А ў нядзельку дожыдаюцца.

**Застольная, пазаабрадавая**

Раскопаю гору высокую,
Дый посею хмелю зелёного,

Дый посею хмелю зелёного,
Дый навару піва солодкого.

По багату сестру тройку я выйшлю,
Бедной ўдове сестре наказ пошлю.

Богатая сестра тройкою едзе,
Бедна ўдова сестра пешком ідзе.

Богатая сестра за столамі,
Бедна ўдова сестра за дзверамі.

Богатая сестра гарэлачку п’е,
Бедна ўдова сестра слёзы ілье.

Ці я ў цебе, братко, не родзіна,
Шо я ў цебе, братко, за дзверыма.












ансамбль „Дубравіца"

